5 лютага 2019 г. Беларускі саюз мастакоў у сталічным Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры правёў пленэр, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння С. Манюшкі. Падчас творчага вечара «Музыкай святой тут поўніцца душа», які прайшоў 24 красавіка ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя новага віртуальнага праекта «Станіслаў Манюшка. Музычны рамантык з Міншчыны», рэалізаванага на інтэрнэт-партале бібліятэкі.

Праведзены шматлікія форумы, канферэнцыі, круглыя сталы, прысвечаныя гэтай падзеі. Так, 3 мая ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адбыўся круглы стол да 200-годдзя з дня нараджэння кампазітара, а таксама прэзентацыя выставы «Станіслаў Манюшка. Падарожжа ў XIX стагоддзе».

19 мая 2019 г. у Вялікім тэатры Беларусі адбылася ўнікальная падзея – канцэрт «Манюшка на Радзіме». А 12 чэрвеня ў яго камернай зале аматарам музыкі прадстаўлены канцэрт «Жыццё ў песні. Старонкі "Хатняга спеўніка" Станіслава Манюшкі». У канцы мая 2019 г. у Архікафедральным касцёле імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі была ўсталявана мэмарыяльная дошка ў яго гонар (скульптар Валяр'ян Янушкевіч). 30 мая 2019 г. Белдзяржтэлерадыёкампанія прэзентавала дакументальны фільм пра С. Манюшку, які ў чэрвені быў паказаны на рэспубліканскім тэлебачанні.

Такія падзеі, звязаныя з жыццём і творчасцю Станіслава Манюшкі, насычаюць жыццё Мінска з моманту нараджэння таленавітага кампазітара да сённяшняга дня.

**С. П. Кубека**

## УДЗЕЛ БЕЛАРУСАЎ І ЎРАДЖЭНЦАЎ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ НА ФРАНТАХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941 – 1945)

Беларускі народ у барацьбу з ворагам уключыўся з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Усяго на франтах вайны змагалася больш мільёна ста тысяч беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Сярод прадстаўнікоў 30 нацыянальнасцей, абараняўшых Брэсцкую крэпасць, былі і ўраджэнцы Беларусі: У. Шаблоўскі, А. Махнач, арганізатар абароны Холмскіх варот крэпасці Я. Фамін і інш.

Створаны ў выключна складаных абставінах Цэнтральны фронт узначаліў ураджэнец Магілёўшчыны з в. Балбечына Горацкага павета генерал-палкоўнік Ф. Кузняцоў. У далейшым ён камандаваў вайскамі Паўночна-Заходняга і Цэнтральнага франтоў, удзельнічаў у баях у Прыбалтыцы, і бітве пад Масквой. Воінскія злучэнні, якія прымалі ўдзел у абарончых баях летам 1941 г., узначальвалі беларусы, генералы І. Карпеза, А. Лапацін, І. Камера, Р. Дзівін, П. Корзун і інш.

Арганізатарам абароны Крычава з'яўляўся ўраджэнец Бабруйшчыны Г. Худалееў, які атрымаў тут сваю першую ўзнагароду – ордэн баявога Чырвонага Сцяга. Пазней ён удзельнічаў у вызваленні Беларусі, дзе за прарыў абароны ў раёне Шуміліна стаў Героем Савецкага Саюза.

Усяго за ўдзел у абарончых баях 1941 г. і праяўлены пры гэтым гераізм 10 прадстаўнікоў Беларусі былі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза: А. Антоненка, Г. Каўшараў, Л. Муравіцкі, Л. Даватар, В. Хігрын і інш. Шасцярых сваіх сыноў адправіла на фронт жыхарка пасёлка Бялынічы Т. Храбрая. Столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную Армію калгаснік з Быхаўшчыны А. Красоўскі. Двое з іх загінула ў баях пад Масквой. Старэйшы Сцяпан стаў маршалам авіяцыі, Героем Савецкага Саюза.

Праславіла беларускую зямлю і сям'я Вайнрубаў з Барысаўскага раёна. Браты Мацей, Яўсей, Зіновій, сястра Раіса прайшлі вайну ад першага дня да апошняга. Мацей і Яўсей за асабісты гераізм былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Пры абароне Масквы вызначыўся стралковы полк, якім камандаваў Д. Гліцэвіч, родам з Мінскай вобласці. У маскоўскім небе першы ў гісторыі вышынны таран здзейсніў лётчык-беларус А. Катрыч. У верасні 1941 г. тараніў нямецкі бамбардзіроўшчык наш зямляк Л. Муравіцкі.

У баях за Ленінград і Сталінград, на Курскай дузе і Каўказе гераічна змагаліся лётчыкі-беларусы Т. Аксакаў, П. Пілютаў, Г. Пінчук, Ц. Жучкоў з в. Багацея Чавускага раёна. За гады вайны ён зрабіў 257 баявых вылетаў, збіў 11 фашысцкіх самалетаў.

Гераічна абараняў Ленінград віцябчанін капітан А. Антоненка. За 34 дні баёў ён збіў 11 самалётаў ворага. Ужо ў ліпені 1941 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Больш за 30 лётчыкаў – ураджэнцаў Беларусі – у час вайны паўтарылі подзвіг М. Гастэлы: І. Катунін, А. Аўдзееў, А. Храпаў і інш. Лётчыкі І. Авекаў, Л. Муравіцкі, М. Пінчук здзейснілі паветраныя тараны. Подзвіг А. Маресьева паўтарыў выхадзец з Лепельскага раёна камандзір авіяэскадрыллі І. Ерашоў.

Член экіпажа падводнай лодкі «С-13» ураджэнец Магілёўшчыны П. Байцоў удзельнічаў у патапленні 3 фашысцкіх транспартаў. За асабістую мужнасць ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Саракавую гвардзейскую дывізію, якая абараняла Сталінград, узначальваў прадстаўнік Магілёўскай вобласці А. Пастрэвіч. У баях Вялікай Айчыннай вайны праславіўся ўраджэнец Пружанскага раёна М. Хоцімскі. За заслугі і гераізм пры арганізацыі і вядзенні баявых аперацый ён быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза, а прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт узнагародзіў яго ордэнам «Легіён пашаны афіцэрскай ступені».

У баях за Каўказ, Крым, Кубань, Кіеў мужна змагаліся танкіст, Герой Савецкага Саюза падпалкоўнік Дз. Сухавараў з в. Жакаўка Горацкага павета і снайпер з Чашніцкага раёна Л. Буткевіч. За гады вайны ён знішчыў 327 гітлераўцаў, з проціватанкавага ружжа заглушыў 22 кулямётныя пункты ворага. Больш 300 забітых фашыстаў было на рахунку снайпера Г. Вялічкі, які быў родам са Шклоўшчыны. 125 гітлераўцаў знішчыў снайпер Ф. Смалячкоў

з Быхаўскага раёна. Ён з'яўляўся адным з ініцыятараў руху за адкрыццё асабістага ўліку забітых гітлераўцаў на Ленінградскім фронце. Поўны кавалер ордэна Славы трох ступеняў снайпер Зайцаў з в. Хоцімск Клімавіцкага раена вызначыўся пры вызваленні Польшчы.

Мужнасць і адвагу ў баях з ворагам праявілі многія жанчыны Беларусі. Больш чым 200 параненых вынесла з поля боя медсястра К. Сірэнка, 146 воінаў выратавала гамяльчанка М. Гарачук. Санінструктар С. Голухава з Гомельскай вобласці толькі за некалькі дзён вайны вынесла 40 параненых. Ва ўсім свеце вядома імя беларускі З. Тусналобавай, якая вынесла з поля боя 128 параненых. У час баёў у Курскай вобласці яна была цяжка паранена і абмарожана, у выніку чаго ёй ампутавалі рукі і ногі. Нягледзячы на інвалліднасць З.Тусналобава актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці рэспублікі. Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа адзначыў яе гераізм медалём Флорэнс Найтынгейл.

Многім ураджэнцам Беларусі пашчасціла прымаць удзел у вызваленні родных мясцін. Мужнасць і адвагу ў баях за рэспубліку праявілі двойчы Герой Савецкага Саюза П. Галавачоў, Героі Савецкага Саюза Д. Казакевіч, А. Сліц, В. Пянькоўскі і інш. Г. Худалееў, ураджэнец Бабруйшчыны, які за арганізацыю абароны Крычава атрымаў ордэн баявога Чырвонага Сцяга. Пазней за прарыў абароны ў раёне Шуміліна атрымаў званне Героя Савецкага Саюза І. Банкузаў, ураджэнец в. Мхінічы Чэрыкаўскага павета (зараз Краснапольскі раён), які вызваляў Віцебск, Оршу, Баранавічы, Мінск і інш. гарады. Усяго за гераізм, праяўлены ў баях за вызваленне рэспублікі, 39 беларусаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

За межамі бацькаўшчыны на завяршаючым этапе вайны праславілі сябе воіны-беларусы Я. Фаміных з Койданава, Л. Хаданевіч з Кармяншчыны, які пры вызваленні Венгрыі паўтарыў подзвіг А. Матросава, А. Жук і А. Дулеба з Міншчыны, А. Шымчук з Бабруйска, А. Мінін з Полаччыны і інш. У баявых дзеяннях на тэрыторыі Балгарыі, Румыніі, Югаславіі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі прымаў удзел беларус, віцэ-адмірал Г. Халасцякоў – Герой Савецкага Саюза, кавалер ордэна Ушакова І ступені.

Пры вызваленні Малдавіі гераічна змагаўся Дз. Жмуроўскі з Клімавіцкага раёна. За подзвіг, здзейснены ў адным з баёў, яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Берлінскай аперацыі ўдзельнічалі воінскія злучэнні, якімі камандавалі ўраджэнцы рэспублікі, генералы Ф. Перхаровіч, А. Каравацкі, І. Юшчук, Я. Фаміных, І. Гусакоўскі, У. Чыстоў, А. Церашкоў, М. Галай, Ф. Шырокі, С. Красоўскі і інш. За ўзяцце Берліна 13 ураджэнцаў Беларусі сталі Героямі Савецкага Саюза: І. Краснік, А. Шмыгун, М. Лусто, А. Пятакевіч, М. Аверчанка і інш.

Сярод вядомых ваеначальнікаў Чырвонай Арміі былі прадстаўнікі Беларусі, маршалы Савецкага Саюза В. Сакалоўскі, І. Якубоўскі. Апошні ўраджэнец в. Зайцава Горацкага раёна. Пазней камандаваў групай войск у Германіі, з'яўляўся галоўнакамандуючым Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі краін-удзельнікаў Варшаўскага дагавора, маршалы авіяцыі С. Красоўскі, І. Пстыга, генералы арміі А. Антонаў, І. Гусакоўскі, генерал-палкоўнікі

А. Бацюня, У. Камера, Ф. Кузняцоў, А. Пянькоўскі і інш. У складзе толькі ваенна-паветраных сіл, бранятанкавых і механізіраваных злучэнняў ваявала амаль 8 тыс. афіцэраў – выхадцаў з Беларусі .

За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях Вялікай Айчыннай вайны, звыш 300 тыс. беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі, 444 сталі Героямі Савецкага Саюза, 67 чалавек – поўнымі кавалерамі ордэна Славы; 4 беларусы – званне Героя Савецкага Саюза атрымалі двойчы: І. Якубоўскі, І. Гусакоўскі, С. Шутаў, П. Галавачоў .

Беларускі народ з вялікай павагай адносіцца да сваіх землякоў – ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, свята шануе памяць тых, хто не вярнуўся з поля бітвы. Аб гэтым сведчаць тысячы брацкіх магіл, помнікаў, мемарыяльных дошак і комплексаў. Імёны герояў увасоблены ў назвах вуліц, школ, мемарыяльных музеяў.

**С. Я. Новікаў**

## ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ ЛЕТАМ 1944 г. У СВЯТЛЕ НОВЫХ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫХ ФАКТАЎ

У аснову нашага гістарыяграфічнага аналізу пакладзены найноўшыя айчынныя (беларускія і расійскія) і замежныя (нямецкія) навуковыя працы, выхад якіх сведчыць не толькі аб пачатку фарміравання новых гістарычных ведаў, але і адпаведных даследчыцкіх наратываў аб баявых дзеяннях Чырвонай арміі і германскага вермахта ў Беларусі летам 1944 года. Адразу ж заўважым, што гісторыкі гэтых дзвюх груп не толькі выкарыстоўваюць розную дакументальную базу, але і кіруюцца процілеглымі метадалагічнымі падыходамі, якія прыводзяць да непараўнальных ацэнак адных і тых жа падзей гісторыі вызвалення Беларусі летам 1944 года.

Беларусь. Зыходным момантам для разгляду баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні тэрыторыі Беларусі ў 1944 г. з'яўляецца навуковы наратыў, закладзены яшчэ ў энцыклапедыі савецкага часу «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945». З яго вынікае, што беларускі чытач там не знойдзе вычарпальную інфармацыю пра няўдалыя спробы Заходняга фронту вызваліць паўночна-ўсходнія раёны Беларусі ўжо восенню 1943 – пачатку 1944 г., паколькі галоўны акцэнт быў зроблены толькі на Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён». У дачыненні да гэтых падзей беларускія даследчыкі выкарыстоўваюць наступную тэрміналогію: Беларуская наступальная аперацыя 1944 г. «Баграціён»; Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя; аперацыя «Баграціён».

Адзначым, да гэтага часу ў беларускай гістарыяграфіі пакуль не праведзена спецыяльнае даследаванне, у аснове якога ляжалі б новыя айчынныя і замежныя дакументы, вынікі найноўшай замежнай гістарыяграфіі ў дачыненні да адлюстравання гісторыі баявых дзеянняў як Чырвонай арміі, так і германскага вермахта ў Беларусі летам 1944 года. Фактам з'яўляецца і тое, што на цяперашні час назапашаны значны эмпірычны матэрыял, які пакуль застаецца без комплекснага аналізу беларускіх гісторыкаў.